# ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА Ў ТВОРЧАСЦІ ЛЕАНІДА ЯКУБОВІЧА

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт»
**Сапега А.М., 1 к., 4 гр., ЛФ**
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к.г.н., дац. Сіткевіч С.А.

Сёлета Леаніду Якубовічу споўнілася б 64 гады. Ён нарадзіўся 21 сакавіка 1948 г. у вёсцы Радкава Салігорскага раёна ў сялянскай сям'і і быў адзінай надзеяй і апорай маці. Для таго, каб больш даведацца пра жыццё Леаніда Якубовіча, мне прыйшлося сустрэцца з яго старэйшай сястрой Нінай Іванаўнай Царык, якая жыве ў вёсцы Радкава Салігорскага раёна. Яна і сёння беражліва захоўвае фотаздымкі брата, яго адзіны паэтычны зборнік, газетныя артыкулы Якубовіча-журналіста, а таксама матэрыялы, прысвечаныя жыццю і творчасці брата.

Калі сённяшняя моладзь пачынае скардзіцца на жыццёвыя цяжкасці, мне хочацца прывесці ў прыклад Л. Якубовіча. Вясковы хлопчык, якога расціла і выхоўвала адна матуля, ён з дзяцінства прывык да цяжкай працы і не чакаў, што нехта вырашыць яго праблемы. Скончыўшы дзесяцігодку, пайшоў працаваць паштаром, апthe аператарам у аддзяленні сувязі вёскі Чапялі, пасля заканчэння Любанскай завочнай сярэдняй школы (1965) – машыністам на другім Салігорскім калійным камбінаце. У 1967 г. быў залічаны ў штат рэдакцыі салігорскай раённай газеты "Шахцёр". А паралельна завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1969 - 1970 гг. працаваў у шахце. Ды яшчэ сам будаваў новую хату і пісаў вершы! І ўсё гэта ў дваццаць гадоў! Раптам усё перакрэсліла жудаснае, кароткае: “Трагічна загінуў...”. 8 чэрвеня 1970 года Леанід спусціўся з клеццю ў шахту - і там здарылася бяда. Жыццё трагічна абарвалася на высокай паэтычнай ноце. У 1979 г. (пасмяротна) выйшаў яго зборнік “Я з вамі, вёсны...”, у які ўвайшло лепшае з таго, што паспеў напісаць малады паэт.

Нягледзячы на маладосць, Л.Якубовіч напісаў шмат філасофскіх твораў, якія ўражваюць глыбокім пранікненнем у сутнасць многіх праблем. Філасофскі роздум пра чалавечую годнасць прысутнічае амаль у кожным вершы. Але гэта не даўно вядомыя, завучаныя словы, не – гэта шчырыя споведзі пра хваляванні, мары, надзеі, веру ў самае добрае, светлае. Малады паэт вельмі адказна ставіўся да сваіх твораў, лічыў: *“...бярыся за пяро толькі тады, калі адчуваеш, што ўжо ўсё выспела ў душы для новага твора - так і звоніць добрымі вобразамі, добрымі думкамі”* (“Усяму свая пара”). *“Чалавек піша вершы, бо толькі яны могуць перадаць яго настрой, яго думкі надзвычай вобразна і светла. Але не ўсім удаецца пазбегнуць пераказу даўно*

Рэпазіторый ГрГМУ

*вядомых ісцін, не ўсім удаецца заглянуць, як кажуць, у глыбіню. А паэзія — гэта тая ж рака, у якой уся свежасць, уся чысціня яе - у глыбіні"* ("Шукаць глыбіню").

Хораша, светла, праўдзіва напісаны верш "Наказ", ён моцна звязаны з нашымі днямі, прасякнуты пачуццём высокай грамадзянскай адказнасці. Праз высокае паэтычнае майстэрства адгукаецца паэт на вострыя праблемы часу. Праблеме пошуку ісціны, шляху ў жыцці прысвечаны вершы "Пошук", "Кроў, кажуць, не дыміцца...":

Глыбока філасафічным па сваім змесце з'яўляецца верш-зварот "Чалавеку", які раскрывае сапраўдны сэнс чалавечага існавання:

Калі песня не грэе
У мароз і завею, -
Дык нашто твая песня!
Калі рукі ніколі
Не зналі мазоляў, –
Для чаго твае рукі!
Калі сэрца не плача,
Як бязногага ўбачыш, –
То не сэрца, а камень!
Калі вечна на ўзмежку,
Без агню і ўсмешкі, –
Дык нашто і жыццё!

Шчасце льецца цераз край, захапленне жыццём адчуваецца ў кожным радку. У гэтым вершы адчуваецца моц і ўпэўненасць паэта, у якога хапіла б мужнасці заўсёды глядзець праўдзе ў вочы і выкінуць з сэрца песню, якая *"не грэе"*, не кранае нікога. Сувязь чалавека з яго продкамі, з лёсам мінулых пакаленняў гучыць у філасофскім вершы "Нараджаемся не для смерці...". Асабліва ўражвае філасофскі верш Л.Якубовіча "Жыццё – нібы цягнік...". Проста дзіўна, колькі жыццёвай мудрасці змяшчае ў сабе гэты твор. Бо напісаў яго зусім малады паэт:

Жыццё – нібы цягнік...
Гады мае – вагоны...
Ўсё болей іх, цягнік усё расце,
Ды сэрца – паравоз іх неўгамонны,
Разгон бярэ, пастуквае часцей...
...Жыццём маім нагружаны вагоны,
Адказна, бо жыццём жа, як-ніяк...
Так хочацца, прымчаўшыся да скону,
Убачыць, што цягнік – не паражняк.

Чытаючы такія творы, здзіўляешся, адкуль у маладога паэта



Репозиторий ГрГМУ

разважлівасць і розум сталага мужчыны, роздумы і заўвагі чалавека мудрага. У цэлым, філасофская лірыка Леаніда Якубовіча складае агромны і важкі пласт у яго творчасці. Паэт пакінуў нам, нашчадкам, залатую спадчыну, якая застанецца і будзе не адзін век дапамагаць нам знайсці адказы на свае ўласныя пытанні.

## ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА МІНСКА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Сіўцэвіч Л.В., 2 к., 5 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

Сталіца Беларусі Мінск - адзін з самых старажытных еўрапейскіх гарадоў. Напярэдадні Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін, што адзначаецца 18 красавіка, аўтар шматлікіх навуковых і краязнаўчых публікацый, прысвечаных мінуламу Мінска, гісторык Уладзімір Дзянісаў адзначае, што, на жаль, у горадзе з тысячагадовай гісторыяй старажытных помнікаў архітэктуры засталося няшмат.

У асноўным гэта камяніцы і сакральныя будынкі, якія змешчаны на тэрыторыі Ракаўскага і Траецкага прадмесцяў, а таксама Верхняга горада, які пачаў фарміравацца ў XVI стагоддзі пасля Вялікага пажара, бо да гэтага горад быў фактычна ўвесь драўляны, і менавіта на гэтым месцы паўсталі першыя мінскія камяніцы.

Самым старажытным будынкам Мінска мог бы стаць праваслаўны храм XI-XII стагоддзя. Яго падмуркі захаваліся да сёння і знаходзяцца зараз пад зямлёю на тэрыторыі Мінскага замчышча (раён Плошчы 8 сакавіка). З тых жа будынкаў, што мы можам пабачыць, самымі старажытнымі з'яўляюцца:

**1. Свята-Пятра-Паўлаўская царква**

Лічыцца, што Петрапаўлаўская царква на Нямізе была заснавана ў 1612 г, алё некаторыя даследчыкі гэтую дату ставяць пад сумнеў. Тым не менш большасць гісторыкаў схіляецца да таго, што гэты будынак быў узведзены ў час першага пажару XVII стагоддзя. У савецкія часы тут месціўся архіў, у 1991-м богаслужэнні ў царкве былі адноўлены.

**2. Свята-Духаўскі манастыр базыльянак**

На тэрыторыі сучаснай Плошчы Свабоды, па вуліцы Энгельса, 1, захаваўся будынак Мінскага Свята-Духаўскага манастыра базыльянак. Будынак, у якім цяпер знаходзіцца дзіцячая музычны школа № 10 імя Глебава, быў заснаваны ў 1641 годзе. Алё яго можна лічыць і значна



Репозиторий ГрГМУ